# У ТЫЯ ГЕРАІЧНЫЯ ДНІ

Падрыхтоўка да абароны Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, мабілізацыя ваенма-абавязаных, перабудова прамысловасці на ваенны лад, фарміраванне знішчальных атрадаў пачаліся ўжо ў першыя дні вайны.

У канцы чэрвеня ў Гомелі на сходзе актыву абласной партыйнай арганізацыі выступіў з дакладам сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панама-рэнка. Ён указаў на неабходнасць будаваць абзрончыя загароды. Кіраўніцтва прамысло-васцю ў новых умовах, падрыхтоўку да абароны, эвакуацыю ажыццяўлялі сакратары Го-мельскага абкома партыі Ф. В. Жыжанкоў, А. А. Куцак, І. П. Кожар, сакратары гаркома Е. І. Барыкін, С. Ф. Антонаў, абком і гарком камсамола на чале з А, Д, Рудаком і А. А. Ісачанкам.

Жорсткія баі на тэрыторыі Гомельшчыны вя ліся ўжо ў пачатку ліпеня. Вораг быў спынены на Дняпры часцямі 21-й арміі. 9 ліпеня 1941 года пачалося фарміраванне Гомельскага палка народнага апалчэння, які складаўся з трох батальёнаў — па колькасці раёнаў горада (Савецкага раёна тады яшчэ не было). У іх уваходзілі мужчыны непрызыўных узростаў і жанчыны, у асноўным рабочыя заводаў «Гомсельмаш», паравозавагонарамонтнага, імя Кірава, фабрыкі «везувій», леса- і тлушчакам-бінатаў, паравознага дэпо.

Сярод апалчэнцаў было многа студэнтаў педагагічнага і лесатэхнічнага інстытутаў, чыгуначнага тэхнікума, 100 чалавек з абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў, некалькі артыстаў абласнога драматычнага тэатра. Усяго ў палку налічвалася больш за 2300 чалавек. Каля 1000 з іх былі камуністамі, звыш 700 — камсамольцамі. Невыпздкова полк народнага апалчэння называлі яшчэ і камуністычным.

Камандзірам палка быў назначены Ф. Я. Уткінт капітан запасу, начаяьнік аддзела баявой падрыхтоўкі абласнога савета Асаавіяхіма, камісарам С. Р. Шчуцкі, дырэктар абласнога драмтэатра, начальнікам штаба А. М. Грынько, інструктар абласнога савета Асаавіяхіма. Штаб знаходзіўся на вул. Першамайскай, 16. У сярэдзіне ліпеня ў Гомель пераехалі ЦК КП(б)Б, СНК і ЦК камсамола Беларусі. Сакратары ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка, Гі. 3. Калінін, М. Я. Аўхімовіч, 1. П. Гакенка, Ц. С. Гарбуноў, Р. Б. Эйдзінаў, У. Н. Малін, старшыня СНК БССР і. С. Былінскі, сакратар ЦК ЛКСМБ М. В. Зімянін аказалі аялікую дапамогу ў арганізацыі абароны на подступах да Гомеля, падполля і партызанскай барацьбы на Гомельшчыне.

У сярэдзіне ліпеня 1941 года ў Гомелі пабываў Маршал Савецкага Саюза С. М. Будзённы. 24 ліпеня быў створаны Цэнтральны фронт (камандуючы генерал-палкоўнік Ф. І. Кузняцоў). Цікава адзначыць яшчэ адзін факт: 132-й стралковай дывізіяй, якая была перакінута пад Гомель, камандаваў С. С. Бірузоў, які пасля «айны стаў Маршалам Савецкага Саюза. У сваіх успамінах ён піша, што пад кірауждтвам ваенных камандзіраў і сапёраў дзесяткі тысяч гамяльчан удзень і ўначы ўзводзілі дзоты, супрацьтанкавыя загароды, стваралі мінныя палі, узводзілі на вулгцах барыкады. У тыя ліпеньскія дні ў баях за Гомель вызначыўся лётчык 9-га знішчальнага авіяпалка лейтэнант С. М. Крывашэін. Ён здзейсніў першы ў небе Гомельшчыны таран нямецкага самалёта. Апалчэнцы разам з часцямі Чырвонай Арміі вялі баі на поўнач ад горада, каля вёсак Краснае, Уза, Касцюкоўка,

Сямёнаўка, Рудзянец, Пакалюбічы, Прудок. У ходзе баёў загінулі многія апалчэнцы, у тым ліку камандзір палка Ф. Я. Уткін і камісар 2-га батальёна М. М. Кунцэвіч.

Гітлераўцы на Гомельскім напрамку страцілі 80 тысяч салдат і афіцэраў, больш за 200 танка, каля 100 самалётаў, многа іншай баявой тэхнікі. Але перавага ў жывой сіле і тэхніцы была пакуль што на баку ворага. У ноч з 19 на 20 жніўня акупанты ўварваліся ў Гомель. Абаронцы горада па мастах цераз Сож адышг лі ў бок Чарнігава і падарвалі за сабой маеты.

12 апалчэнцаў, у тым ліку Ф. Я. Уткін і М. М. Кунцэвіч, пахаваны ў Камсамольскім скверы, на правым беразе Сожа. Там жа знаходзіцца магіла падпольшчыка Героя Савецкага Саюза Ц. С. Барадзіна. У 1975 годзе над брацкай ма-гілай быў пастаўлены помнік — чыгунная стэла. Воіны, якія загінулі пры абароне Гомеля, пахаваны ў брацкай магіле па вул. Савецкай (у Студэнцкім парку) і на Навабеліцкіх могілках. Ва ўрочышчы «Новікаўскі гай» яшчэ раней з'явілася брацкая магіла тых, хто загінуў у чэрвені 1941 года ў час налёту варожай авіяцыі. У 1960 годзе абаронцам Гомеля быу пастаўлены помнік у гарадскім пасёлку Касцюкоўка, а ў 1961 годзе — у вёсцы Пакалю бічы. На будынку тэхнікума чыгуначнага транспарта ўстаноўлена мемарыяльная дошка М. М. Кунцэвічу (ён быў дырэктарам гэтага тэхнікума перад вайной). Ёсць мемарыяльныя дошкі па вул. Пралетарскай, 15, дзе размяшчаўся ЦК КП(б)Б, на будынку абласнога краязнаў чага музея, дзе знаходзіўся штаб Цэнтральнага фронта, на Доме культуры будаўнікоў (вул. Першамайская, 16), узведзеным на месцы будынка, у якім размяшчаўся штаб Гомельскага палка народнага апалчэння.

Памяць пра абарону Гомеля жыве і ў назвах вуліц. У Касцюкоўцы ёсць вуліца Апалчэн-цаў і вуліца Беразоўскага, які быў начальнікам Гомельскага гарнізона, у Чыгуначным раёне Гомеля — вуліцы Уткіна, Кунцэвіча, Яфрэмава, Каменшчыкава, Рыднага (дзве апошнія названы ў гонар ваенных лётчыкаў — абаронцаў Гомеля), у Центральным раёне — вуліца Ко-жзра, у Савецкім — Барыкіна.